СЕМАНТЫЧНЫ АСПЕКТ У РАЗВІЦЦІ МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ І МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Маўленне з’яўляецца найважнейшай творчай псіхічнай функцыяй чалавека. Творчасць у маўленчай дзейнасці праяўляецца на розных узроўнях і ў рознай ступені. Асвойваючы моўныя сродкі і формы маўлення, што існуюць у культуры народа, дзіця “гуляе” з гукамі, рыфмамі, сэнсамі, эксперыментуе і стварае свае арыгінальныя словы, словазлучэнні, граматычныя формы, якія яно ніколі не чула ад акружаючых. Такім шляхам дзіця пазнае моўныя заканамернасці. Інакш кажучы, яно прыходзіць да моўнага чуцця, да моўнай нормы праз эксперымент – праз яе парушэнне.

Дашкольны і малодшы школьны ўзрост – гэта перыяд, калі дзецям уласціва найбольшае чуццё да моўных з’яў, таму важна выкарыстоўваць адзначаны многімі даследчыкамі (М. І. Гваздзёвым, К. І. Чукоўскім, Ф. А. Сахіным, Т. М. Ушаковай, А. Г. Арушанавай і інш.) факт асаблівай “лінгвістычнай адоранасці” дзяцей ва ўзросце 4–7 гадоў. Калі падыходзіць да авалодання дзіцем роднай мовай проста як да развіцця маўлення, абмежаванага патрабаваннямі яго зносін з акружаючымі людзьмі, то гэта не будзе адпавядаць патэнцыяльным магчымасцям дзіцяці ні ў авалоданні моўнай рэчаіснасцю як асаблівым аб’ектам пазнання, ні ў разумовым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

развіцці, ні ва ўдасканаленні самога маўлення. Як сцвярджаў вядомы даследчык дзіцячага маўлення Ф. А. Сахін, “засваенне дзецьмі роднай мовы ўключае разам з фарміраваннем практычных маўленчых навыкаў таксама фарміраванне асэнсавання моўнай рэчаіснасці, якое можа быць названа лінгвістычным развіццём дзіцяці”.[1]

У сучаснай педагогіцы пад слоўнікавай работай разумеецца мэтанакіраваная педагагічная дзейнасць дарослага, якая забяспечвае эфектыўнае засваенне дзецьмі слоўніка роднай мовы. Развіццё слоўніка ў дзяцей разумеецца як доўгі працэс асваення слоўнага запасу роднай мовы: авалодання словамі, якія абазначаюць прадметы і з’явы навакольля на аснове іх цэласнага ўспрымання; засваення зместу слова на ўзроўні яго паняційнага значэння, а таксама засваення слова як адзінкі мовы на ўзроўні сэнсу.

Такім чынам, пашырэнне слоўніка дзяцей, яго колькасны рост – важная задача маўленчага развіцця і разумовага выхавання дзіцяці. Аднак гэта не адзіны накірунак слоўнікавай работы. Даследчыкі (Л. А. Айдарава, Ф. А. Сахін, А. С. Ушакова, Л. М. Струніна, Л. А. Калунова, А. А. Смага і інш.) падкрэсліваюць, што ў слоўнікавай рабоце неабходна накіроўваць увагу на семантычны бок лексічнага развіцця дзяцей: ўзбагачэнне і актывізацыя

[1] *Сохин Ф. А*. Осознание речи дошкольниками // Подготовка детей к школе в детском саду. М.: Педагогика, 1978. С. 50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

слоўніка павінны ажыццяўляцца не толькі як састаўныя часткі азнаямлення з навакольнай рэчаіснасцю, але і як вырашэнне моўных задач.

Значыць, у працэсе засваення роднай мовы авалоданне лексікай адбываецца на аснове як тэматычных сувязей слоў, так і сувязей уласна моўных (сінанімічных, антанімічных, асацыятыўных, словаўтваральных). Каб узбагаціць як маўленчае, так і разумовае развіццё дзяцей, трэба праводзіць мэтанакіраваную работу над словам як структурнай адзінкай мовы, вызначаючай уласцівасцю якой з'яўляецца семантычны змест, значэнне.

Удасканаленне семантычнага аспекту слоўнікавай работы – гэта не адасобленая задача ў методыцы развіцця маўлення, асэнсаванне моўных з'яў, якое забяспечвае магчымасць пераводу маўленчых уменняў і навыкаў у адвольны план. Дзякуючы гэтаму ствараюцца ўмовы для дасягнення большай эфектыўнасці маўленчых зносін і далейшага авалодання мовай, маўленчага развіцця. Семантычны бок засваення лексікі адыгрывае пэўную ролю ў развіцці разумення дзецьмі значэнняў слоў, у фарміраванні дакладнасці словаўжывання, семантычнай спалучальнасці слоў. Фарміраванне ў дзяцей валодання семантычнымі сувязямі і адносінамі ў галіне лексікі ў рэшце рэшт служыць удасканаленню звязнага маўлення дзяцей, дзякуючы развіццю ўмення падбіраць словы дакладна ў адпаведнасці са зместам сваёй думкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Акрамя таго, маўленне дзіцяці становіцца больш выразным, адрозніваецца лексічным багаццем.

Уласна моўнымі характарыстыкамі слова выступаюць полісемія (мнагазначнасць), сінанімічныя і антанімічныя адносіны, таму ў базіснай праграме дашкольнай адукацыі “Пралеска” змест работы па ўзбагачэнні слоўніка цесна пераплятаецца з працэсам фарміравання элементарнага асэнсавання некаторых ўласна слоўных адносін.

Ужо для чатырохгадовых дзяцей маўленне ўпершыню са сродку зносін ператвараецца ў аб’ект пазнання. У гэтым узросце дашкольнікі пачынаюць адрозніваць сэнсавы і фармальны бакі слова. Праграмай прадугледжана выхаванне ў дзяцей сярэдняга дашкольнага ўзросту цікавасці да паходжання слова (чаму так называюцца *кухар*, *вадзіцель*, *настаўнік*?). Дзеці вучацца падбіраць словы з процілеглым значэннем (антонімы: *доўгі – кароткі, высока – нізка*), падобныя па значэнні (сінонімы: *ішоў – крочыў, бяжыць – імчыцца, нясецца; маленькі – малюсенькі*). Адбываецца знаёмства з мнагазначнымі словамі (*ножка крэсла – ножка стала – ножка ў грыба – ножка дзіцяці; іголка для шыцця, у вожыка на спіне, для ўколаў, елачная*).

У групе “Фантазёры” педагог працягвае развіваць у дзяцей разуменне такіх моўных з’яў, як антанімія (*свежы хлеб – чэрствы хлеб; свежая кашуля – брудная кашуля*), сінанімія (*свежы хлеб – мяккі, цёплы хлеб; свежая кашуля*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– *чыстая кашуля*), мнагазначнасць (*вострый нож, вострый язык, вострая гарчыца*), аманімія (*каса, лісічкі*), вучыць актыўна выкарыстоўваць іх у маўленні, знаёміць з даступнымі ім фразеалагізмамі (*бачыць наскрозь, пакінуць з носам* і да т. п.).

У першым класе пачатковай школы таксама прадугледжана правядзенне ўласна моўнай па змесце работы, накіраванай на фарміраванне ў шасцігодак валодання семантычнымі сувязямі і адносінамі ў галіне лексікі. Працягваецца работа па выхаванні ў дзяцей чуйнасці да сэнсавых адценняў слоў (*камар, камарык, камарочак*), фарміраванню ў іх уменння адрозніваць і разумець самыя простыя выпадкі мнагазначнасці слоў, аманіміі, падбіраць сінонімы і антонімы (без ужывання тэрмінаў).

Для практычнага засваення семантычных радоў слоў з дзецьмі ўсіх узроставых груп праводзяцца дыдактычныя гульні і спецыяльныя лексічныя практыкаванні. Асаблівае месца сярод іх адводзіцца гульням і практыкаванням, заснаваным на вершаваным займальным матэрыяле.

Роля паэтыкі ў антагенэзе чалавека (у развіцці яго лексікона, сродкаў выразнасці, вобразнасці, дакладнасці і інш.) надзвычай вялікая. Даследчыкі (І. П. Грэхава і інш.) сцвярджаюць, што вершаванае маўленне слаба, несістэматычна і неадпаведна свайму значэнню прадстаўлена ва існуючай практыцы дзіцячага маўленчага развіцця, што не дазваляе дзіцяці паспяхова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

авалодваць паўнацэнным маўленнем. Развіццё дзіцячага маўлення, не праходзячы неабходнага этапа паэтычнай метафарызацыі, актыўна згортваецца. Вершаваны этап у развіцці маўлення можна папоўніць у вучэбнай сітуацыі – сітуацыі каштоўнасных зносін з нагоды маўлення ў самым шырокім сэнсе слова.[2]

Зыходзячы са сказанага, зразумела, наколькі важную ролю ў засваенні дашкольнікамі і шасцігадовымі вучнямі моўных з'яў адыгрывае займальны матэрыял: пацешкі, загадкі, прыказкі, скорагаворкі, вершы, лічылкі і інш. З дапамогай такога матэрыялу педагог можа выклікаць і падтрымліваць непасрэдную цікавасць да роднай мовы, у пэўнай меры пераадольваць эмацыянальную няўстойлівасць дзяцей, засяроджваць увагу маленькіх лінгвістаў на моўных з'явах, з якімі іх знаёмяць.

Трэба адзначыць, што ў дзіцячым фальклоры шмат лічылак, дражнілак, загадак, пабудаваных на гульні гукаў. Яны ўключаюць вялікую колькасць слоў, якія не маюць значэння. Гэта, напрыклад, усім вядомая дзіцячая лічылка "Энікі-бэнікі елі варэнікі" альбо менш вядомая загадка "Стаіць пендра, на пендры – дэндра, у дэндры – ундра". Сучасныя даследчыкі дзіцячага маўлення А. Г. Арушанава (Тамбоўцава), А. С. Ушакова і інш. лічаць неабходным уключаць падобныя моўныя гульні як элемент практыкі ў

[2] *Грехова И.П.* Стихосложение как форма развития детской речи. – М., 1998.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

педагагічны працэс, паколькі яны дапамагаюць развіваць творчыя механізмы маўлення, дыялектычнасць, парадакальнасць думкі, здольнасць выходзіць за межы агульнапрынятага, традыцыйнага, звыклага.

Мастацкія творы садзейнічаюць развіццю вобразнага маўлення дзяцей, фарміраванню ў іх паэтычнага слыху, пачуцця рытму. Дашкольнікі і малодшыя школьнікі лёгка запамінаюць гэтыя творы і выкарыстоўваюць іх у самастойнай дзейнасці, што ўзбагачае іх маўленне.

Разам з моватворчасцю, адной з важнейшых састаўляючых дзіцячай камунікатыўнай самадзейнасці выступае дыялог як від маўленчых зносін. Таму педагогі, якія працуюць з дзецьмі 4–7 гадоў, навучанне ажыццяўляюць ў форме сеансаў (урокаў) актывізуючых зносін.[3] Сцэнарый зносін уключае размову педагога з дзецьмі, дыялогі дзяцей паміж сабой, моўныя гульні і пошукавую дзейнасць дзяцей у сферы мовы і маўлення. Гэта садзейнічае развіццю як дыялагічных зносін, так і слоўнай творчасці дашкольнікаў і малодшых школьнікаў.

Прапануемыя заняткі могуць і павінны быць займальнымі, незааранізаваннымі, праходзяць жыва, цікава і весела. Прамыя ўказанні настаўніка, вучэбная матывацыя, жорсткая рэгламентацыя тут не дапускаюцца. Дарослы наладжвае дзейнасць дзяцей, але гэтая дзейнасць не

[3] Пра сцэнарыі актывізуючых зносін як форму арганізацыі дзіцячай дзейнасці гл. у кн.: Арушанова А. Г. Речь и речевое общение детей 3 – 7 лет. М.: Мозаика-Синтез, 1999. С. 139–142.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выступае як форма навучання, хаця ў працэсе яе дзеці вучацца. Гэта хутчэй досуг, забава і да т. п. Матывацыя дзейнасці – гульнявая, камунікатыўная. Удзел у ёй у асноўным добраахвотны. Дарослы выступае як раўнапраўны партнёр па зносінах. Ён паважае права дзіцяці на ініцыятыву, яго жаданне гаварыць на тэмы, якія яго цікавяць, не адказваць на незразумелыя і нецікавыя пытанні, не паўтараць некалькі разоў тое, што ўжо ўсе чулі і г.д.

Ніжэй прыводзяцца прыкладныя сцэнарыі актывізуючых зносін па фарміраванні ў дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту семантычнага боку маўлення. У аснову распрацаваных сцэнарыяў пакладзены вершы, загадкі, прыказкі і прымаўкі, з дапамогай якіх абыгрываюцца семантычныя сувязі і адносіны паміж словамі.

Кожны сцэнарый можа быць выкарыстаны педагогам або настаўнікам поўнасцю альбо часткова. Педагог можа выбраць тое, што з’яўляецца найбольш прыдатным для групы ці класа, у якім ён працуе, стварыць нешта сваё на аснове прапануемага матэрыялу. Заняткі можна скараціць, правесці не за адзін раз, камбінаваць. Іх пажадана праводзіць у гульнявым пакоі, пакоі казак, экалагічным пакоі і да т. п. Гэта садзейнічае наладжванню свабоднай непрымусовай абстаноўкі, стварае перадумовы для праяўлення непасрэднасці, больш цеснага ўзаемадзеяння адно з адным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ